Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-03-29

# У пошуках дзяржаўнасці

***21 сакавіка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя першай часткі выдання «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.» (плануюцца 2 тамы), а таксама іншых найноўшых даследаванняў супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.***




Да імпрэзы была арганізавана выстаўка «Беларуская дзяржаўнасць: старонкі гісторыі (канец XVIII – першая палова XIX ст.)», на якой прадстаўлена каля 150 дакументаў з фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, што распавядаюць пра падзеі мінулага, садзейнічаюць фарміраванню беларускай нацыянальнай ідэі.

Сярод самых ранніх выданняў – «Обозрение Росийской империи в нынешнем ею новоустроенном состоянии» (СПб., 1790), напісанае віцэ-адміралам Сяргеем Пляшчэевым, дзе ён ахарактарызаваў склад насельніцтва Полацкага і Магілёўскага намесніцтваў: «Жители оного суть Поляки и Литва, Римско-католицкаго закона, из которых малое число Греческого исповедания, прочия Унияты...». У той час так вызначалася нацыянальная прыналежнасць: жыхары Рэчы Паспалітай, Польшчы – палякі, жыхары ВКЛ, Літвы – ліцвіны, улічвалася таксама веравызнанне. Пра колькасць і склад насельніцтва беларускіх зямель паведамляецца таксама ў выданнях «Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г.», «Памятные книжки...» розных губерняў Беларусі.

Сярод значных юрыдычных дакументаў XIX ст. – «Полное собрание законов Российской империи», «Свод законов Российской империи», якія ўтрымліваюць інфармацыю пра палітыку ўладаў у дачыненні да заходніх губерняў.

Не менш цікавыя дакументальныя крыніцы – мемуары гістарычных асобаў, напрыклад, успаміны сенатара-ваяводы Каралеўства Польскага Ляона Дэмбоўскага (СПб., 1898) пра падзеі канца XVIII ст. – 1831 г.

Таксама прадстаўленыя выданні перыядычнага друку, якія даюць магчымасць уявіць атмасферу грамадскага жыцця Беларусі першай трэці XX ст. Сярод іх «Наша Ніва» (Вільня, 1906) – «першая беларуская газета з рысункамі», якая была сапраўдным арганізатарам нацыянальнага руху. Пэўную цікавасць уяўляюць дакументы, якія датычацца ўсталявання савецкай улады на тэрыторыі Беларусі – рэзалюцыі партыйных з'ездаў, канферэнцыяў, пленумаў ЦК. Можна пабачыць і дакументы, што захаваліся ў невялікай колькасці экзэмпляраў, на некаторых з іх кніжныя знакі былых уладальнікаў.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***

"Краязнаўчая газета". У пошуках дзяржаўнасці